8. Бурбіс А. Беларуская Сацыялістычная Грамада ў першым перыядзе яе працы [1903-1907гг.] //Зб. “Беларусь”. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху.-Мінск: ЦВК БССР, 1924.-С.177-182.
9. Ж.З.Х. /З.Жылуновіч/. Арганізацыя сіл. /Да гісторыі Савецкае Беларусі/ //Полымя.-1924, №2.-С.163-179.
10. Ж.З.Х. Гістарычны момант //Полымя.-1924, №4.-С.144-158.
11. Ж.З.Х. Уступамі да Акцябра //Полымя.-1923, №5-6.-С.141-149, №7-8- С.86-91.
12. Жылуновіч З. Ад Кастрычніка 1917 да лютага 1918 года //Полымя.-1924, № 1.-С.153-167.
13. Жылуновіч З. Алесь Бурбіс /рэвалюцыйная характарыстыка/ //Полымя.-1927, №2.-С.180-195.
14. Жылуновіч З. Беларуская інтэлігенцыя ў гістарычным аспекце // Полымя.-1926, №6.-С.74-98.
15. Жылуновіч З. Беларускія секцыі РКП і стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублікі //Полымя.-1928, №10.-С.73-93.
16. Жылуновіч З. Два бакі беларускага руху //Полымя.-1923, № 3-4.-С.69-74.
17. Жылуновіч З. Люты - Кастрычнік у беларускім нацыянальным руху //Зб. “Беларусь”. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху.-Менск: ЦВК БССР, 1924.-С.182-194.
18. Жылуновіч З . З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 сакавіка 1917г. //Полымя.-1925, №6.-С.202-206.
19. Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і вызваленчага руху.-Мінск, 1924.-321с.
20. Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і вызваленчага руху.-Мінск, 1924. -С.195-215.
21. Ангаретис З. Белорусская Социалистическая Громада//Вперед.-1923, №2-3.-С.64-67.
22. Мялешка М. Барацьба Беларускай Сацыялістычнай Грамады за зямлю ў 1905 г.// Полымя.-1926, №1.-С.152-159.
23. Шлюбскі А. Канфіскацыя першага беларускага часопіса “Наша Доля” // Савецкая Беларусь.-1923, №153.-С.3.
24. Шлюбскі Ал. Да гісторыі канфіскацыі “Нашай Долі” //Полымя.-1925, №5. - С.157-163.
25. Шлюбскі А. Да гісторыі БСГ. // Полымя.- 1925, №5 .-С.157-163.
26. Чарвякоў А. За Савецкую Беларусь.-Мінск, 1927.-73с.
27. Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў /1903-1918 г.г/.-Вільня: Беларускае Выдавецкае Таварыства, 1928.-52с.

# НОВЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ З ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ І ПАВІЛЛЯ

*С.С. Юрэцкі*
*Мінск, Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі*

Публікацыя прысвечана археалагічным навуковым даследаванням, якія былі праведзены на тэрыторыі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай обласці, а таксама Маладзечанскага і Вілейскага раёнаў Мінскай вобласці ў 2019 г. Мэтай праведзеных работ быў пошук новых помнікаў археалогіі, а таксама абследаванне раней вядомых.

**Матэрыял і метады.** Асноўным матэрыялам даследавання сталі новыя археалагічныя крыніцы, што былі назапашаны падчас правядзення аўтарам археалагічных разведак на тэрыторыі Беларускага Панямоння і Павілля. Таксама папярэдне вывучалася спецыялізаваная літаратура па тэме [3, 5] і архіўная археалагічная дакументацыя, якая захоўваецца ў Цэнтральным навуковым архіве НАН Беларусі (Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі) [1–2; 4; 6–7].

Даследаванне грунтуецца на коле метадаў, у аснову якіх пакладзены прынцыпы комплекснага падыходу, гістарызму і аб’ектыўнасці. Выкарыстоўваліся фармальна-тыпалагічны, статыстычны, стратыграфічны і гісторыка-параўнальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Палявыя работы на тэрыторыі Дзятлаўскага раёна праходзілі ў ваколіцах в. Нясілавічы з мэтай абследавання раней вядомых помнікаў археалогіі.

Нясілавічы-1. Помнік выяўлены Н.М. Гурынай [1; 2]. Даследваўся М.М. Чарняўскім [7], В.Л. Лакізай [4; 5]. Помнік знаходзіцца 657на паўночным ускрайку вёскі на буйным пясчаным узгорку. GPS помніка: 53.626734°N 25.326535°E.

У 2019 г. на развеянай частцы помніка былі сабраны артэфакты: фрагмент крамянёвай пласціны з рэтушшу, крамянёвая пласціна, крамянёвы адшчэп, кавалак крэменю нявызначаны (2). Помнік датуецца каменным-бронзавым вякамі.

Нясілавічы-2. Помнік выяўлены Н.М. Гурынай [3]. Абследваўся М.М. Чарняўскім [7], В.Л. Лакізай [4; 5]. Помнік знаходзіцца на пясчаным узвышшы ў левабярэжжы р. Нёман у 0,5 км на захад ад вёскі. GPS помніка: 53.626403°N 25.316901°E.

У 2019 г. на развеянай частцы помніка былі сабраны артэфакты: фрагмент сценкі кружальнай керамікі, крамянёвая пласціна, крамянёвы нуклеус, кавалак крэменю нявызначаны. Помнік датуецца каменным-бронзавым вякамі, а таксама Новым часам.

Нясілавічы-5. Помнік выяўлены Н.М. Гурынай [1; 2]. Абследваўся М.М. Чарняўскім [7]. Помнік знаходзіцца на пясчанай дзюне ў левабярэжжы р. Нёман у 0,5 км ад вёскі. GPS помніка: 53.625130°N 25.315914°E. У 2019 г. на развеянай частцы помніка артэфактаў выяўлена не было.

Нясілавічы-6. Помнік выявіла Н.М. Гурына [1; 2]. Даследваўся М.М. Чарняўскім [6; 7], В.Л. Лакізам [4; 5]. Помнік знаходзіцца на залесенай левабярэжнай тэрасе р. Нёман у 1,5 км на паўднёвы-захад ад в. Нясілавічы. GPS помніка: 53.619887°N 25.312481°E.

У 2019 г. на развеянай частцы помніка былі сабраны артэфакты: скол з крамянёвага нуклеуса (2), крамянёвы адшчэп (4), крамянёвы скрабок, кавалак крэменю нявызначаны. Помнік датуецца каменным-бронзавым вякамі.

Нясілавічы-12. Помнік выявіў М.М, Чарняўскі [7]. Абследаваў В.Л. Лакіза [4; 5]. Помнік знаходзіцца на пясчанай дзюне ў левабярэжжы р. Нёман у 1,3 км на захад ад вёскі. GPS помніка: 53.622203°N 25.311665°E.

У 2019 г. на развеянай частцы помніка былі сабраны артэфакты: крамянёвая пласціна, фрагменты сценак кружальнай керамікі (7), фрагменты сценкі ляпной керамікі (2), скол падпраўкі крамянёвага нуклеуса, крамянёвы адшчэп, фрагмент глінянай абмазкі печы, фрагмент жалезнага кованага вырабу, скол з крамянёвага нуклеуса, крамянёвы нуклеус, крамянёвы скрабок, крамянёвая пласціна, скол з крамянёвага нуклеуса (5), крамянёвы адшчэп (15), кавалак крэменю нявызначаны (6). Помнік папярэдне датуецца каменным-бронзавым вякамі, а таксама Сярэднявеччам і Новым часам.

Палявыя работы на тэрыторыі Маладзечанскага раёна ў 2019 г. адбываліся з мэтай пошуку помнікаў каменнага-бронзавага вякоў і праходзілі ў басейне р. Рыбчанка на паўночна-ўсходняй мяжы Маладзечанскага і Вілейскага раёнаў.

Вялікі Бор-1. Помнік выяўлены ўпершыню. Паселішча знаходзіцца на левабярэжнай тэрасе р. Рыбчанка ў 500 м на поўнач ад в. Вялікі Бор. Прыкладныя памеры помніка 250×100 м.

У 2019 г. на помніку за 20 м ад аўтадарогі быў закладзены шурф памерамі 2 м². GPS шурфа: 54.265465°N 27.209671°E.

Стратыграфія шурфа: 0–0,05 м – дзёрн і падсцілаючы яго зямельны пакроў; 0,05–0,25 м – цёмны-чорны слой супесі; цёмна-шэры слой супесі са знаходкамі; 0,25–0,45 м – светла-жоўты слой супесі са знаходкамі; 0,4–0,45 м – мацярык.

Знаходкі, якія былі выяўлены падчас выбаркі шурфа: 5 крамянёвых адшчэпаў без рэтушы, 52 фр. ляпной керамікі (з іх 5 фр. з арнаментацыяй). Сярод элементаў арнаментацыі прадстаўлены адбіткі шнура, а таксама пракрэсленыя лініі. Керамічныя матэрыялы па сваіх паказчыках адпавядаюць старажытнасцям кола культуры шнуравой керамікі.

Палявыя работы на тэрыторыі Вілейскага раёна ў 2019 г. праходзілі з мэтай пошуку новых помнікаў археалогіі ў ваколіцах возера Вула.

Бараўцы-1. Помнік выяўлены ўпершыню. Размешчаны ў 0,4–0,5 км на поўнач ад в. Бараўцы на карэнным беразе. Прыкладныя памеры: 1300×1000 м.

На ворным полі адзначаліся адзінкавыя знаходкі расшчапаных крамянёў і фрагменты кружальнай керамікі. На краю паселішча адразу за прасёлачнай дарогай быў закладзены шурф памерамі 1 м². GPS шурфа: 54.528923°N 26.793975°E.

Стратыграфія шурфа: 0–0,05 м – дзёрн і падсцілаючы яго зямельны пакроў, 0,05–0,3 м – пласт ворыва; 0,35 м – мацярык. У шурфе 2019 г. быў знойдзены адзінкавы фрагмент кружальнай керамікі. Помнік папярэдне можа быць аднесены да стаянкі каменнага-бронзавага вякоў, а таксама да селішча эпохі Сярэднявечча і Новага часу.

**Заключэнне.** Вынікам праведзеных у 2019 г. работ стала абследаванне раней вядомых помнікаў у ваколіцах в. Нясілавічы (Дзятлаўскі раён), а таксама выяўленне 2 новых помнікаў археалогіі: Вялікі Бор-1 (Маладзечнскі раён) і Бараўцы-1 (Вілейскі раён).

Помнік Вялікі Бор-1 інтэрпрэтаваны ў якасці стаянкі позняга неаліту (кола культуры шнуравой керамікі). Помнік Бараўцы-1 папярэдне інтэрпрэтаваны ў якасці стаянкі каменнага-бронзавага вякоў, а таксама селішча Сярэднявечча і Новага часу.

1. Гурина Н. Н. Отчёт о работе неолитического отряда Прибалтийской экспедиции в 1957 году / ФАНД ЦНА НАН Беларусі. – Справа № 136. – 1957. – 45 с.

2. Гурина Н. Н. Отчёт о полевых исследованиях на территории Белоруссии в 1958 году / ФАНД ЦНА НАН Беларусі. – Справа № 167. – 1958. – 8 с.

3. Гурина Н. Н. Новые данные по каменному веку северо-западной Белоруссии // МИА. – № 131. – 1965. – С. 141–203.

4. Лакіза В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на Панямонні ў 1997 годзе / ФАНД ЦНА НАН Беларусі. – Справа № 1708. – 1997. – 69 с.

5. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – с. 204.

6. Чарняўскі М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1976 годзе / ЦНА НАН НАН Беларусі. – Справа № 550. – 1976. – 22 с.

7. Чарняўскі М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях Нёманскай неалітычнай групы ў 1982 годзе / ФАНД ЦНА НАН Беларусі. – Справа № 799. – 1982. – 43 с.